# МАСЛЕНІЧНЫЯ ЗАБАВЫ

Метадычная распрацоўка пазакласнага мерапрыемства

**В. В. Саўчук,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі
гімназіі № 2 г. Пінска

Метадычная распрацоўка "Масленічныя забавы" – гэта сцэнарый святочнай праграмы, прысвечанай народнаму святу Масленіца. Прадугледжвае рэалізацыю наступнай выхаваўчай задачы: стварэнне неабходных умоў для выхавання маральна-духоўнага станаўлення асобы.

Сцэнарый свята пабудаваны ў форме конкурснай праграмы. Мерапрыемства прадугледжвае маштабнасць, г.зн. лепш яго праводзіць на прышкольнай тэрыторыі.

Свята прызначана для вучняў V-XI класаў, настаўнікаў, бацькоў.

Рэкамендуецца для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, класных кіраўнікоў V-XI класаў, педагогаў-арганізатараў, кіраўнікоў тэатральных гурткоў.

**Мэта:** праз увасабленне беларускага народнага свята "Масленіца" данесці да навучэнцаў узоры народнага мастацтва; абудзіць цікавасць да роднай мовы, культуры беларускага народа, яго гістарычнай спадчыны.

**Умовы правядзення:** мерапрыемства праводзіцца на стадыёне (прышкольнай тэрыторыі). Кожны клас рыхтуе "пікнік": стол, засланы абрусам, збоку ўпрыгожаным эмблемай-плакатам з сімваламі свята і прымаўкай; на сталах стаяць самавары і ежа: бліны, абаранкі, чай. Гучаць народныя песні.

**Удзельнікі:** вядучыя, Вясна, валачобнікі, 2 каманды па 12 чалавек, гледачы (вучні V-XI класаў).

**Абсталяванне:** планшэты вядучым, чучала Масленіцы, 5 размаляваных самалёцікаў, 4 калодкі, 4 карткі з прыпеўкамі, 4 абручы, канат, торбачкі, набітыя сенам, лаўка, паваротныя слупкі, вяроўка, вяроўкі па 50 см., сняжкі з паперы, 2 патэльні, 2 бліны з паралону, 2 крэсла, 2 мятлы, кеглі, 2 валёнкі, посцілка, пальчаткі, 2 турнікі, 6 шалікаў, 2 касынкі, 2 мяшкі, абаранкі, стужкі, медалі, пралескі, шыльда, каляровая крэйда для журы, граматы.

**Працягласць правядзення:** 90 хвілін.

## Ход мерапрыемства

***Гучыць музыка. На сярэдзіну стадыёна, прытанцоўваючы, выходзяць вядучыя.***

**1В.** Гэй, весялей збірайцеся, людзі!

Зараз свята да нас прыбудзе!
**2В.** Ад усіх дзвярэй, ад усіх варот
Збірайся хутчэй, спяшайся, народ!
**1В.** Міласці просім
Завітаць да нас у госці!
**2В.** Будзем песні спяваць,
Весяліцца ды гуляць!
**1В.** Да нас вясна ідзе,
Сонейка нясе!
**2В.** Вясну сустракаем, Зіму адпраўляем!
У нас сёння –
**Разам.**Масленіца!
***Гучыць музыка. З'яўляюцца валачобнікі, якія нясуць чучала Масленіцы.***
**1В.** Сустракаем нашых валачобнікаў.
**2В.** Вітаем усіх, хто часіну знайшоў,
На наша свята пагуляць прыйшоў!

**1 валачобнік.** Прывезлі вам Масленіцу,
Сустракаем ластавіцу,
**2 валачобнік.**Наша Масленіца гадавая,
Яна госцейка дарагая.
**3 валачобнік.** Масленіца-крывашыйка,
Сустракаем цябе харашэнька:
**4 валачобнік.** Сырам, маслам, і блінам,
І румяным пірагом!
**5 валачобнік.** Шырокая Масленіца,
Мы табою хвалімся,
На горках катаемся,
Блінамі аб'ядаемся!
**6 валачобнік.** А ў нас сёння Масленіца!
Прыляцела ластавіца!
**7 валачобнік.** Села-пала на калу,
Кідала масла па каму.
**8 валачобнік.** А мы Масленку чакалі –
Усю нядзельку выглядалі.
**9 валачобнік.** А мы думалі Масленка сем нядзелек,
Ажно Масленка сем дзянёчкаў!
**10 валачобнік.** Нас Масленка падманула,
На сем нядзелек паста пасадзіла.
**Валачобнікі** *(разам)*

Сырна вам!
Маслена вам!

***Гучыць музыка. Валачобнікі выконваюць танец-флэшмоб.***

**1В.** Светач, ты толькі паглядзі, колькі народу сабралася! Мы свята пачынаем!

**2В.**Чакаюць вас гульні вясёлыя і спаборніцтвы забаўныя!

**1В.**На другіх паглядзіце і сябе пакажыце!

**2В.**Толькі такі ў нас закон: сумным і злым на свята праход забаронены!

**1В.**Сярод вас няма такіх? Не? А вось мы зараз і праверым.

***Вядучыя падыходзяць да гасцей і задаюць пытанні віктарыны.***

1. Адкажыце, якая страва ўказвае на тое, што сённяшняе свята сапраўды Масленіца? (Бліны)
2. А з чым суадносіцца блін у гэтае свята? (З сонцам)
3. Што пачынацца на наступны дзень пасля Масленіцы? (Вялікі пост)
4. Назавіце, калі ласка, традыцыйныя святочныя забавы. (Перацягванне каната, бег у мяшках, гульня ў сняжкі, спальванне чучала)

**1В.** Дзякуй вялікі! Да Вялікага паста яшчэ далёка. А святочных забаў мы ведаем многа!

**2В.**Тады пачынаем?

**1В.** Пачынаем!

***Гучыць музыка***

**2В.**Мы запрашаем паўдзельнічаць у масленічных забавах 2 каманды. Сустракаем каманду "Дранікі"! Апладысменты!

**1В.**А зараз, каманда "Аладкі"! Сустракаем!

**2В.** Дазвольце прадставіць журы:

- Сяброўкі Вясны,спадарыні Вяснянкі:..!

**1В.**Спадар Веснавік, ..! Апладысменты!

**2В.** А ўзначальвае журы, канешне, сама спадарыня Вясна! Але пакуль яна хаваецца і сочыць за намі.

**1В.** Вясна абавязкова завітае да нас, але спачатку трэба ўсім пастарацца і асабліва камандам!

**2В.** За перамогу ў конкурсе або правільны адказ кожная каманда атрымае абаранак, які будзе вешацца на стужку. У якой каманды звязка абаранкаў атрымаецца даўжэйшая, тая і пераможа.

***Гучыць музыка***

**1В.** Першы дзень Масленкі называлі "Сустрэчай" ці  "Стрэчанне". У гэты дзень Масленку сустракалі і велічалі. Давайце і мы з вамі зробім гэта.

**1В.** Для першага конкурсу станьце, каманды, адна насупраць другой. Такім чынам вы павітаеце і адзін аднаго, і нашу Масленіцу. А вітаць вы будзеце вясёлымі прыказкамі і прымаўкамі па чарзе.

*(Каманды загадзя рыхтуюць прыказкі і прымаўкі пра Масленіцу)*

**2В.** За правільны адказ уручаецца абаранак.

1. Масленіца-палізуха: сыр і масла палізала.
2. Масленка з блінамі, а пост з грыбамі.
3. Будзе Масленка, будзе ля пупа красненька.
4. Масленка-палізуха працягніся хоць да Духа.
5. Масленка-белавутка казала вясна будзе, ды не хутка.
6. А мы Масленку чакалі, усе аладкі выпякалі.
7. Масленіца-аб'ядуха – грошаў прыбяруха.
8. Пост падняў кабыле хвост, а там – Масленіца.
9. Не жыццё, а Масленіца.
10. Не ўсё кату Масленіца, а будзе Вялікі Пост.
11. Блінцы, блінчыкі, бліны, як колы ў вясны.
12. Бліны – сонейку сваякі.
13. Масленка ідзе, бліны ды мёд нясе.
14. Без бліна не масляна.
15. Дзе бліны, там і мы, дзе з маслам каша, там месца наша.
16. На горцы пакатацца, у блінах паваляцца.
17. Бліны і пацалункі ліку не любяць.
18. Блін не клін – бруха не распора.
19. На мазаны блін і кот па-другому глядзіць.
20. Блінная яда — да вечара хада.
21. Сядзі, баба, да вечара – табе бліноў напечана.

***Гучыць музыка***

**1В.** Ой, штосьці я замерзла.

**2В.** І сапраўды, давайце наладзім карагод і запросім усіх.

**1В.** Я аб’яўляю новы конкурс - **“Карагод”**. Удзельнікі кожнай каманды, бярыцеся за рукі і такім чынам, не разрываючы рук, запрашайце ўсіх гасцей да ўдзелу ў карагодзе словамі: “Чапляйцеся!”

**2В.** Каманда, якая назбірае больш чалавек, у якой ланцужок будзе даўжэйшы, тая і атрымае абаранак. (пакуль гучыць музыка)

**1В.** Гэй, народ! Збірайся ў карагод!
**2В.** Гэй, народ! Вясна ля варот!
**1В.** Дзяўчаты-маладзіцы,
Прыгажуні-чараўніцы,
Падымайцеся,
У святочныя адзенні апранайцеся!
**2В.** Будзем усе разам спяваці, скакаці,
Вясну-красну гукаці!

**1В.** А зараз  давайце памераемся ланцужкамі!
**2В.** Утвараем вялікае кола, а валачобнікаў запрашаем у сярэдзіну!

*(Вядучыя мераюць ланцужкі і пад музыку ўтвараюць з імі вялікае кола, пасярэдзіне якога танцуюць валачобнікі)*

***Гучыць музыка***

**1В.** Вялікі дзякуй усім! Вось і павіталі мы нашу Масленіцу. Гледачы і каманды могуць займаць свае месцы. А мы працягваем!

***Гучыць музыка***
**2В.** Другі дзень Масленіцы называўся “Зайгрышы” ці “Загвіны”. У гэты дзень каталіся з гор, каб рос доўгі лён. Вось і мы зараз вызначым, у якіх гаспадароў лепшы лён вырасце ў гэтым годзе.
**1В.** Кожная каманда павінна заплесці касу, толькі не з ільну, а з шалікаў. Запрашаюцца па 4 удзельнікі. Адзін чалавек трымае шалікі, тры астатнія заплятаюць. Пераможа каманда, якая хутчэй і прыгажэй запляце касу.
***Гучыць музыка***
**1В.** Косы вы можаце аддаць журы для ацэньвання.
А мы, пакуль журы падводзіць вынікі, прапануем камандам **загадкі**:
- Што на двары – гарою, а ў хаце – вадою?
  *(Снег.)*
- Лезе праз акно сівае сукно. Што гэта?
  *(Мароз.)*
- Што зімою камлём угару расце?
  *(Лядзяш.)*
- Усе яго любяць, а як паглядзяць – моршчацца.
  *(Сонца.)*
- Хто двума бадаецца, чатырма ходзіць, адным мух ганяе?
  *(Карова.)*
- Што расцілі, збіралі, тапталі, ткалі і на стол заслалі?
  *(Абрус.)*
- Новая пасудзіна, а ўся ў дзірках. Што гэта?
  *(Рэшата.)*
- Белая кабыла ўвесь лес з'ела.
  *(Печ.)*
- Вадкае, а не вада, белае, а не снег.
  *(Малако.)*
- Сівая карова праз дарогу пройдзе, а белая засядзе.
  *(Сыроватка, цадзілка, тварог.)*
- Без кліноў, без капытоў, само падыходзіць. Ніхто яго не трывожыць.
  *(Цеста.)*

- На плеш капнеш, уставіш, папарыш, дастанеш, паправіш.
  *(Патэльня, блін.)*

**2В.** Правільна! Малайцы! Загадкі адгадалі. А цяпер нас чакаюць зноў вясёлыя спаборніцтвы.

**1В.** Бліны – галоўны пачастунак на Масленіцу. Яны падобны да сонца, якому людзі вельмі рады пасля доўгай зімы. У сераду на Масленіцу цешчы пяклі бліны і чакалі да сябе ў госці зяцёў, каб пачаставаць іх.

**2В.** Зараз каманды таксама паспрабуюць напячы бліноў. Наступны конкурс “Бліны” будзе праходзіць у тры этапы.

***Гучыць музыка***

***1этап. Эстафета “Патэльня на пліце”*** *(удзельнікі па чарзе ставяць патэльню на пліту-стул).*

***2 этап. Эстафета “Патэльня ў печы”*** *(капітаны каманд з завязанымі вачыма ставяць патэльню пад стул, удзельнікі падказваюць).*

***3 этап. Эстафета “Астудзі блін”*** *(удзельнікі па чарзе перадаюць адзін аднаму гарачы блін).*

***Слова журы для  падвядзення вынікаў папярэдніх конкурсаў.***

***Гучыць музыка***

**1В.** Вось і надышоў чацвёрты дзень Масленіцы, які называўся “Дзень святога Уласа”. Лічылася, што ў гэты дзень павінен першы раз праспяваць жаваранак.

**2В.** А яшчэ ўшаноўвалі маладых, якія ажаніліся ў гэтым годзе, і хадзілі ў лазню.

**1В.** А зараз зноў гульня. Запрашаем 5 смелых хлопцаў з гледачоў.

**2В.**Кожны з вас атрымлівае птушачак *( размаляваныя самалёцікі)*. Вам трэба адправіць сваіх птушачак як мага далей. Чыя даляціць далей, той і пераможца.

***Гучыць музыка, удзельнікі па чарзе пускаюць размаляваных птушак. Пераможца атрымлівае прыз.***

**1В.** Пераможца можа прайсці на месца, а вы, хлопцы, пакуль што застаньцеся. На Масленіцу быў такі звычай “Калодкі вешаць”. Вешалі звычайна калодкі тым хлопцам, якія яшчэ не ажаніліся. А мы вам калодкі вешаем за тое, што ў нашай гульні прайгралі. *(На ўдзельнікаў вешаюць калодкі.)*

**2В.** Вы, хлопчыкі, можаце, канешне, адкупіцца, бо калі не адкупіцеся, то цягаць вам гэтыя калодкі да тае пары, пакуль не знойдзеце сабе нявесту. Зразумелі? А адкупацца вы будзеце прыпеўкамі. Трымайце.

***Вядучы раздае прыпеўкі***

1. Не хадзіце, дзеўкі, у лазню,
   Не хадзіце парыцца.
   Ад гарачае прыпаркі
   Макіяж адваліцца.
2. Я па беражку бягу –
   Бераг асыпаецца.

Я бяззубую люблю –
Яна не кусаецца.

3. А ў Толевай гармоні
Планкі пазалочаны
Не любіце, дзеўкі, Толю!
Толя развалочаны.

4. Напячы, кума, бліноў,
Ды каб былі пышныя,
Бо на Масленічны тыдзень
Можна з’есці й лішняе!

**1В.** Пакуль хлопцы рыхтуюцца, я прапаную камандам эстафету ***“Тачка”***. Каманды разбіваюцца на пары, аднаму з пары неабходна быць “тачкай” – грузавым транспартам з адным колам і дзвюма ручкамі (кола – рукі, ручкі – ногі), а другому – вадзіцелем. “Тачка”, рухаючыся на руках, павінна даехаць да паваротнага слупка, памяняцца ролямі і вярнуцца назад, дзе ўжо да руху падрыхтавана другая “тачка”.

***Гучыць музыка***

**2В.** Вернемся да хлопцаў і паслухаем, як яны спяваць умеюць!

***Хлопцы па чарзе спяваюць.***

**1В.** Паглядзіце, дзяўчаты, якія ж малайцы! Апладысменты! Вызвалім нашых малайцоў? Не хадзіць жа ім з калодкамі ўсё жыццё.

***Гучыць музыка. Пад апладысменты гледачоў дзяўчаты хлопцам здымаюць калодкі.***

**1В.** Прыйшоў пяты дзень Масленіцы, які называўся “Цешчыны вячоркі”. У гэты дзень зяці сваіх любімых цешчаў у госці запрашалі.

**2В.** Хата ў зяця павінна быць, канешне, вельмі прыбранай. Раней пыласосаў не было, хаты прыбіралі мятлой. І я запрашаю каманды да ўдзелу ў **эстафеце “Хто хутчэй на мятле”**.

**1В.** Трэба прабегчы вярхом на мятле змейкай і не збіць кеглі, пастаўленыя ланцужком. Пераможа тая каманда, у якой колькасць збітых кегляў будзе меншай.

***Гучыць музыка***

**2В.** А зараз зноў конкурс для гледачоў!

**2В.** Запрашаюцца 2 удзельнікі. Конкурс называецца “Мятла на лбе”. Паспрабуйце як мага далей пранесці мятлу на лбе.

***Гучыць музыка. Падвядзенне вынікаў.***

**2В.** Мы з вамі добра весяліліся, аж дачакаліся шостага дня Масленіцы. У гэты дзень нявестка збірала да сябе ў госці ўсю мужаву радню.

**1В.** Вось і мы запрашаем каманды на вясёлую полечку. Якая каманда будзе весялей яе выконваць, тая і пераможа.

***Гучыць полечка, усе танцуюць. Падводзяцца вынікі.***

**2В.** Скажыце, калі ласка, што вам нагадвае гэты абруч?

**1В.** Ён круглы, як сонейка. А на Масленіцу вялікая пашана была тым рэчам і дзеянням, якія нагадваюць сонца. І бліны круглыя ды жоўтыя, і колы, якія часта запальвалі, таксама круглыя.

**2В.** Нават на конях ездзілі вакол вёскі, каб адзначыць кола. А мы зараз усё забылі. Але гуляць з абручамі таксама любім.

**1В.** О, гэта вельмі масленічная гульня. Давайце і мы з вамі згуляем. Запрашаем ад кожнай каманды па 4 дзяўчыны. Падыходзьце, калі ласка. Тая дзяўчына, якая даўжэй пакруціць абруч, і будзе пераможцай.

***Гучыць музыка. Гульня "Хто даўжэй пракруціць абруч".***

**1В.** Наступнае спаборніцтва для каманд – "Перацягванне каната". Правілы простыя: хто перацягне – той перамог. Але праводзіць мы будзем у 2 этапы:
традыцыйна і стоячы спінай адзін да аднаго.

***Гучыць музыка***

***Гульня "Бой фламінгаў"***

**2В.** Для ўдзелу ў гульні "Бой фламінгаў" запрашаюцца два гледачы.

**1В.** Вы становіцеся ў круг, падымаеце адну нагу, трымаючы яе рукой. Патрэбна, скачучы на адной назе, штурхаць адзін аднаго ў плячо, каб выпхнуць з круга. Хто першы выпхне саперніка – той перамог.

***Гучыць музыка***

**1В.*Эстафета "Скаканне ў мяшках"(для каманд)***

**1В.**Наступны конкурс сярод гледачоў - ***"Бой багатыроў".***

**2В.** Удзельнікі станавіцеся на лаўку! У руках вы трымаеце торбы, напхнутыя сенам. Трэба торбай збіць саперніка з лаўкі. Хто першы саб'е – той перамог.

***Гучыць музыка***

**1В.** А зараз прапаную наладзіць спаборніцтвы ў кіданні валёнак. Хто жадае, выходзьце, калі ласка. Прыз - смачны аладак!

***Гучыць музыка***

**2В.**Гледачам вялікі дзякуй за актыўнасць. І зноў удзельнічаюць каманды. Запрашаюцца па 4 удзельнікі.

**1В.**Вашая задача – зрабіць як мага больш скачкоў праз скакалку ўчацвярых. Будзем лічыць усе разам….

***Гучыць музыка***

**2В.** Я прапаную ўсім звярнуць сваю ўвагу на пляцоўку з турнікамі для падцягванняў. І запрашаю да ўдзелу ў конкурсе чатырох гледачоў.

***Гучыць музыка***

**1В.**А мы ўжо наладзілі месца для конкурсу "Адцісканні ад зямлі". Запрашаюцца ўдзельнікі. Давайце іх падтрымаем апладысментамі!

***Гучыць музыка***

**1В.** Наступная гульня - "Сняжкі".

*(Памочнікамі нацягваецца вяроўка, уздоўж якой - сняжкі. Пакуль гучыць музыка, каманды перакідваюць сняжкі праз вяроўку. Там, дзе сняжкоў будзе менш, тая і пераможа).*

***Гучыць музыка***
Сняжкі ўдзельнікам на памяць, яны прынясуць вам удачу і поспех.
**1В.** Ай ды зімушка-зіма!
Зіма цудоўная была!
**2В.** Але час зіму праганяць
Час вясну сустракаць!
**1В.**Масленіцу праважаем
Вясну сустракаем.
І вы, дзеці, развітвайцеся з Масленіцай і з зімой.
**1 валачобнік.** Ты бывай, бывай, наша шырокая!
**2 валачобнік.** Прыходзіла ты з дабром, з сырам, маслам і яйкам.
**3 валачобнік.** З блінамі, пірагамі і аладкамі.
**4 валачобнік.** Ты бывай, Масленіца, бывай, зіма!
**Усе:** Прывітанне, вясна!
***Гучыць музыка. Усе ўдзельнікі свята становяцца ў кола. Запальваецца чучала Масленіцы.***
**4 валачобнік.** Гары, гары жарка, прыедзе кухарка.
**5 валачобнік.** Кухарка на карове, кухар — на кабыле.
**6 валачобнік.** Дзеці на цялятах, слугі на шчанятах.
**1В.** Годзе, сняжыначкі, сыпацца з неба,
Цёплага сонца чакае ўжо глеба.
**5валачобнік.** Мы нагуляліся з вамі ўволю,
Баб наляпілі са снегу даволі.
**2В.** Хутка растопяць нас сонца прамені,
Рэк, ручаёў мы пачуем бурленне,
**6 валачобнік.** Удосталь нап'ецца матуля-зямліца
Свежай сцюдзёнай вясенняй вадзіцы.

*Калі чучала згарыць, валачобнікі гукаюць вясну.*
***Гучыць музыка***
**1 валачобнік.**Благаславі, Божа, вясну-красну.
На ціхае лета, на буйное жыта.
**2 валачобнік.** Каб наша жыта ў трубы павілося,
У трубы павілося, на бок схілілася.
**3 валачобнік.** На полі снапамі, а ў гумне тарпамі.
На таку ўмалотна, у арудзе прысыпна.
**4 валачобнік.** А ў млыне прывольна, а ў дзяжы падыходна,
А ў пячы пячыста, а на стале краіста.
**5 валачобнік.** Прыйдзі, вясна, прыйдзі, красна,
Да нас у таночак,
Прынясі збожжа, прынясі красак,
Каб звіць вяночак.

**6 валачобнік.** Прыйдзі, вясна, да нас з радасцю,
З вялікай да нас міласцю!
***Удзельнікі свята хорам клічуць вясну.***
Прыйдзі, вясна, прыйдзі, красна,
Да нас у таночак,
Прынясі збожжа, прынясі красак,
Каб звіць вяночак.
***Гучыць музыка***
***З'яўляецца Вясна, адорваючы прысутных галінкамі вярбы.***
**7 валачобнік.**Гэй, вясна-красна, што ты нам прынясла?
**Вясна.** Я вам прынесла на зямельку травіцу,
На травіцу расіцу,
На лясочак лісточак,
На дзяўчатак вяночак.

Бачу я, што чакалі вы вясновае абуджэнне прыроды. І да свята добра падрыхтаваліся. А бліноў колькі напяклі! Яны вельмі падобныя на сонца, а значыць, дапамагаюць паскорыць надыход цяпла. Я назірала за святам і вельмі ўдзячная ўсім, асабліва камандам "Аладкі" і "Дранікі". А зараз мы са спадаром Веснавікам і маімі сяброўкамі Вяснянкамі падвядзём вынікі конкурсаў і ўзнагародзім каманду-пераможцу.

***Уручаюцца граматы і медалі, Вясна абсыпае каманду-пераможцу пралескамі і спявае песню-падарунак.***
***Гучыць песня Вясны***
**2В.**Так добра мы з вамі гулялі, што і да апошняга сёмага дня Масленіцы дабраліся, які ў народзе называўся "Прабачальная бяседа". У гэты вечар усе родныя прасілі прабачэння адзін у аднаго.
**1В.**Звычайна казалі: "Прабач, калі саграшыў перад табой справай ці языком". А цяпер прыйшоў час прасіць прабачэння адзін у аднаго.
*Гучыць музыка, усе прысутныя просяць адзін у аднаго прабачэння, абдымаюцца і цалуюцца.*
**2В.**На жаль, прыйшоў час развітвацца.
**1В.**Дзякуй вам, даражэнькія, за спрыт, за весялосць вашу. У народзе кажуць: "Хто людзей весяліць, за таго ўвесь свет стаіць".
**2В.**Вось і мы з вамі сёння добра павесяліліся, у гульні пагулялі, смачных бліноў пакаштавалі.
**1В.**Ну ўсё, даражэнькія. Бывайце,
Блінцы, варэнне спажывайце,
2**В.**Ды Масленку ўспамінайце.
***Гучыць музыка***